© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Беларускі касцёл у Вільні (стар. 2) Моладзь адчувае сябе ў Еўропе (стар. 2)
Наш сцяг над галоўнай вяршыняй Каўказа (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар
Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя
газеты СВАБОДА
Наклад 32.080
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Серада, 19 лістапада 1997 г. № 128 Кошт свабодны

Аднаму ордэн, другому – ордэр

Старшыні калгасаў у Беларусі бываюць розныя: адных садзяць у турму, другім пры жыцці ставяць помнік.

У той час як старшыня АТ «Рассвет», двойчы герой сацыялістычнай працы Васіль Старавойтаў сядзіць у следчым ізалятары КДБ, на радзіме другога ўладальніка дзвюх геройскіх зорак, старшыні калгаса «Советская Белоруссия» Уладзіміра Бядулі ў райцэнтры Камянец Брэсцкай вобласці адкрыты бронзавы бюст.

Традыцыя ставіць помнікі пры жыцці двойчы героям ідзе яшчэ з савецкіх часоў, але У.Бядуля, які атрымаў сваю другую зорку незадоўга да распаду СССР, у гэтым сэнсе аказаўся абдзеленым — бюст на радзіме яму паставіць не паспелі. Не атрымаў У.Бядуля бронзавага падарунка і да нядаўняга 70-годдзя. І вось у мінулую нядзелю «несправядлівасць» была ліквідаваная: у адпаведнасці з указам Лукашэнкі бронзавы бюст старшыні калгаса і дэпутата прэзідэнцкай палаты быў урачыста адкрыты перад раённым Домам культуры ў Камянцы. Аўтар помніка — мінскі скульптар Святлана Гарбунова. На цырымонію адкрыцця прыехалі першы намеснік кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Уладзімір Русакевіч, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Уладзімір Заламай і іншыя чыноўнікі. Бядулю назвалі *«залатым фондам беларускай зямлі»* і сказалі, што *«чалавек, які 42 гады жыцця аддаў калгасу, дастойны памятнага бюста пры жыцці»*. Аднак не ўсім калгаснікам выпадае такі гонар.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

У наступным нумары

У рэдакцыю СВАБОДЫ паступіў зварот Зянона Пазьняка да грамадзянаў Беларусі, у якім лідэр БНФ заклікае дамагацца адстаўкі прэзідэнта Лукашэнкі шляхам «масавага грамадскага націску ва ўсіх сферах жыцця».

«Аднак, — піша З.Пазьняк, — змагаючыся за адстаўку Лукашэнкі, мы павінны памятаць, што галоўная наша палітычная задача, якую ўвесь час сцвярджае Народны Фронт і да чаго мы імкнемся, гаворачы пра адстаўку, — гэта ліквідацыя ўвогуле прэзідэнцкай сістэмы на Беларусі і скасаванне пасады прэзідэнта. Беларусь мусіць быць не прэзідэнцкай, а парламенцкай краінай. Інакш узнікнуць новы дыктатар (ці паўдыктатар), новая маскоўская марыянетка».

Поўны тэкст ліста Зянона Пазьняка будзе надрукаваны ў СВАБОДЗЕ ў пятніцу

Свабодная прэса ў Гродне

Сустрэча з чытачамі

У Гродне адбылася сустрэча чытачоў з журналістамі мінскіх незалежных выданняў.

У горад над Нёманам спецыяльна прыехалі супрацоўнікі «Белорусской деловой газеты», штотыднёвікаў «Имя» і «Свободные новости», а газету СВАБОДА прадстаўляў наш уласны карэспандэнт Сяргей Астраўцоў. Сустрэча паказала: чым больш улады прыціскаюць свабодную прэсу, тым большай становіцца цікавасць да яе з боку чытачоў.

Дарэчы, на Гродзеншчыне, у параўнанні з іншымі абласцямі, СВАБОДА мае найбольш сваіх падпісчыкаў. Можа быць, гэта звязана з тым, што першы нумар беларускай газеты СВАБОДА выйшаў у 1902 г. менавіта на Гродзеншчыне — у маёнтку Лябёдка цяперашняга Шчучынскага раёна. У наступным месяцы будзе 95 гадоў з таго часу, як СВАБОДА ўпершыню пабачыла свет.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

Юрысты супраць цэнзуры

Свае захады па ўдасканаленні закона аб друку прапануе Цэнтр юрыдычнай дапамогі, які нядаўна быў створаны пры Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ).

«Гэтыя рэкамендацыі адрасаваныя ўсім, хто зацікаўлены ў стварэнні прававой дэмакратычнай дзяржавы», — заявіў на прэс-канферэнцыі ў БАЖ адзін з супрацоўнікаў цэнтра, вядомы ў краіне юрыст Міхаіл Пастухоў. Ён падкрэсліў, што цэнзура ў Беларусі «дагэтуль існуе». На думку М.Пастухова і іншых юрыстаў, якія працавалі разам з ім над «рэкамендацыямі», калі ў дзяржаўных СМІ цэнзура існуе ў выглядзе загадаў рэдактараў «не асвятляць» тую ці іншую тэму, альбо «не кранаць» тую ці іншую асобу, то, каб уплываць на недзяржаўныя выданні, прыдумана больш хітрая сістэма. У яе ўваходзяць, лічаць юрысты, такія меры, як завышаныя расцэнкі на паліграфічныя паслугі для недзяржаўных СМІ, права дзяржкамітэта па друку спыніць выхад СМІ, і, нарэшце, забарона ўвозу ў краіну друкаванай прадукцыі, якую чыноўнікі палічаць шкоднай для дзяржавы.

На думку экспертаў, улады павінны заняцца раздзяржаўленнем СМІ, адмовіцца ад дзяржаўнай манаполіі на выдавецкую базу, забяспечыць рэальны доступ журналістаў да крыніцаў інфармацыі і лібералізаваць цяперашні парадак рэгістрацыі друкаваных СМІ. Не абышлі сваёй увагай юрысты таксама тэлебачанне і радыё. Яны рэкамендавалі прыняць спецыяльны закон, прысвечаны электронным СМІ, у якім прадугледзець стварэнне грамадскіх саветаў па тэлебачанні і радыё.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Фестывалю не будзе. Будзе мітынг

Дзяржаўны камітэт па справах моладзі адмовіўся фінансаваць правядзенне ў Мінску першага фестывалю маладзёжных і дзіцячых арганізацыяў.

Першы фестываль маладзёжных і дзіцячых арганізацыяў павінен быў прайсці ў Мінску 22-23 лістапада, але ён не адбудзецца. Як паведамілі ў арганізацыі «Грамадзянскі форум» (гэта маладзёжная структура Аб'яднанай грамадзянскай партыі), Дзяржаўны камітэт па справах моладзі адмовіўся выдзеліць на правядзенне фестывалю абяцаную суму ў памеры 1.500 долараў ЗША.

Прадстаўнікі дзяржкамітэта матывавалі гэта адсутнасцю грошай, аднак, на думку прэзідэнта «Грамадзянскага форуму», дэпутата Вярхоўнага Савета 13-га склікання Уладзіміра Навасяда, прычына ў іншым. Рэч у тым, што час правядзення фестывалю супадае з датай акцыі пратэсту, якую плануе правесці апазіцыя да ўгодкаў рэферэндуму. У.Навасяд лічыць: улады спалохаліся, што падчас фестывалю «нядобранадзейныя» арганізацыі могуць агітаваць моладзь узяць удзел у шэсці і мітынгу апазіцыйных сілаў.

БелаПАН

Бундэстаг даў Мінску час падумаць

13 лістапада ў Боне Бундэстаг (нямецкі парламент) разглядаў праект рэзалюцыі пад назвай: «Беларусь павінна вярнуцца да дэмакратыі і прававой дзяржавы».

Гэты дакумент быў прапанаваны чатырма асноўнымі парламенцкімі фракцыямі: хрысціянскімі дэмакратамі, «зялёнымі», сацыял-дэмакратамі і свабоднымі дэмакратамі.

Без дэбатаў праект рэзалюцыі быў прыняты за аснову. У дакуменце адзначаецца, што прэзідэнт Лукашэнка, *«выкарыстоўваючы неканстытуцыйны рэферэндум, увёў аўтарытарнае прэзідэнцкае праўленне»*. У прыватнасці, нямецкія парламентары звяртаюць увагу на такія факты, як ліквідацыя законна выбранага парламента, абмежаванні свабоды друку, сходаў і дэманстрацыяў. Бундэстаг заклікае прэзідэнта Лукашэнку *«вярнуцца да дэмакратыі і прынцыпаў прававой дзяржавы, паважаць асноўныя правы чалавека, вярнуць законна выбранаму парламенту ягоныя паўнамоцтвы»*. Калі Мінск да гэтага не прыслухаецца, то *«Беларусь не можа разлічваць на працяг эканамічнай, фінансавай і кансультатыўнай дапамогі з боку Германіі і еўрапейскіх краінаў»*, — адзначаецца ў рэзалюцыі.

У прэс-службе беларускага міністэрства замежных справаў не рассакрэцілі інфармацыю з нямецкага парламента, спаслаўшыся на беларускае пасольства ў Боне, якое, маўляў, яшчэ не даслала ўсе дакументы. Між тым у МЗС нам сказалі, што заклапочаныя «жорсткай танальнасцю» выступленняў нямецкіх парламентарыяў. Паседжанне, дарэчы, скончылася амаль апоўначы. Канчатковае зацвярджэнне рэзалюцыі пра сітуацыю ў Беларусі Бундэстаг адклаў на некалькі тыдняў.

Такім чынам, афіцыйны Мінск мае час падумаць над тым, ці ёсць сэнс паглыбляць канфлікт з самай уплывовай еўрапейскай краінай. Гэта пагражае не толькі палітычнымі, але і сур'ёзнымі эканамічнымі наступствамі, паколькі Германія з'яўляецца галоўным партнёрам Беларусі ў далёкім замежжы. Толькі за 9 месяцаў гэтага года тавараабарот нашай краіны з ФРГ склаў 636,6 мільёна долараў.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

«Беларускае лобі» ў Кангрэсе ЗША

Беларуская Народная Рэспубліка застаецца суб'ектам міжнароднай палітыкі.

15 лістапада ў Нью-Брансўіку каля Нью-Йорка адбылося чарговае паседжанне Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Па словах Сяргея Навумчыка, які браў удзел у паседжанні, галоўным накірункам дзейнасці Рады застаецца спрыянне беларускай дэмакратыі праз уплыў на ўрадавыя і грамадскія арганізацыі заходніх краінаў. Сёння, паведаміў С.Навумчык, Рада пачала фармаваць своеасаблівае «беларускае лобі» ў Кангрэсе ЗША; ужо вядуцца перамовы з сенатарамі і кангрэсменамі. Мэта гэтай палітычнай дзейнасці — аказанне максімальнага міжнароднага ўплыву на сённяшнія ўлады Беларусі.

На паседжанні Рады абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння з рознымі палітычнымі сіламі Беларусі. Раду БНР турбуе, што міжнародная рэакцыя на дыктатуру ў Беларусі цалкам абмінае такі аспект, як этнічная дыскрымінацыя беларусаў, якая выяўляецца, паміж іншым, і ў закрыцці беларускіх школ. У сувязі з гэтым Рада БНР звярнулася да АБСЕ з прапановамі накіраваць у Беларусь спецыяльную міжнародную камісію, якая б разгледзела факты дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце.

Месяц таму ў Канадзе сябры Рады БНР стварылі спецыяльны фонд, сродкі якога прызначаюцца на дапамогу беларускім студэнтам, рэпрэсаваным за ўдзел у масавых акцыях. Бліжэйшым часам Рада БНР накіруе пасылкі з дапамогай сем'ям з Нясвіжскага раёна, якія пацярпелі ад сёлетняга ўрагану.

БелаПАН

ПРАЦЭС

Бард у турме

Чацвёрты месяц сядзіць у следчым ізалятары гродзенскай турмы вядомы беларускі бард з Гомеля Андрэй Мельнікаў.



10 жніўня ён быў затрыманы літоўскімі памежнікамі на беларуска-літоўскай мяжы і перададзены беларускаму боку. За час знаходжання пад следствам Андрэя некалькі разоў выклікалі на допыт, нядаўна тэрмін утрымання Мельнікава пад вартай быў падоўжаны яшчэ на месяц.

30-гадоваму А.Мельнікаву прад'яўленае абвінавачванне па тым жа арт. 80 КК РБ, што і тэлежурналісту Паўлу Шарамету, — незаконны пераход мяжы. Гэты артыкул прадугледжвае пакаранне да пяці гадоў пазбаўлення волі. Між тым, як сцвярджае жонка арыштаванага Анжэла, гаварыць пра наўмыснае перасячэнне мяжы з якімі-небудзь палітычнымі ці камерцыйнымі мэтамі няма падставаў, хутчэй за ўсё пераход мяжы адбыўся па неасцярожнасці.

Тым не менш тое, што справа Мельнікава доўжыцца такі працяглы час і яшчэ не скончылася банальным штрафам, паказвае: следства нечага чакае, магчыма, менавіта заканчэння справы Шарамета. Калі гэта так, дык вырашэння лёсу барда яго жонцы і паўтарагадоваму дзіцяці прыйдзецца чакаць доўга.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

У 1998 год – з газетай СВАБОДА

Падпіску можна аформіць на любы тэрмін. Не хочаце плаціць адразу за паўгода — выпісвайце газету на адзін месяц. Гэта каштуе ўсяго 30 тысяч рублёў.

Падпіска на СВАБОДУ прымаецца ва ўсіх аддзяленнях пошты і «Белсаюздруку».

Наш падпісны індэкс 63887

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Прыватны сэрвіс – лепшы

Падчас сацыялагічнага апытання, праведзенага Беларускім інстытутам інфармацыі і прагнозу, грамадзянам ад 18 гадоў і старэйшым было прапанавана выказаць сваё стаўленне да малой прыватызацыі і ходу эканамічных пераўтварэнняў у краіне.

На анкету адказалі 2.550 рэспандэнтаў. Больш як палова (55%) на пытанне *Які тып эканомікі вы лічыце найбольш прымальным?* адказалі: «Змешаная (з элементамі рыначнай і планавай) эканоміка». Кожны чацвёрты рэспандэнт (25%) аддае перавагу рыначнай эканоміцы; прыхільнікаў планавай эканомікі толькі 18%.

Рэспандэнтам таксама было прапанавана ацаніць якасць сервісу ў прыватызаваных крамах, прадпрыемствах бытавога абслугоўвання і грамадскага харчавання. Большасць апытаных (57%) канстатавалі, што ў прыватызаваных прадпрыемствах абслугоўваюць лепш; 30% рэспандэнтаў не заўважылі зменаў і толькі 3% сказалі, што прыватны сервіс горшы.

Саму ж ідэю прыватызацыі аб'ектаў рознічнага гандлю, бытавога абслугоўвання і грамадскага харчавання падтрымліваюць 54% апытаных. Адмоўнае стаўленне да прыватызацыі аб'ектаў камунальнай уласнасці выказаў кожны чацвёрты апытаны — 26%. Астатнія — амаль 20% — да гэтага працэсу абыякавыя.

Будзе зона «Мінск»

Падрыхтоўку дакументаў аб стварэнні свабоднай эканамічнай зоны «Мінск» плануецца завяршыць да канца лістапада.

Прадстаўляючы канцэпцыю праекта, дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Агенцтва развіцця свабоднай эканамічнай зоны «Мінск» Мікалай Цэдрык адзначыў, што стварэнне СЭЗ «Мінск» *«дазволіць адпрацаваць новыя механізмы прыцягнення ўнутраных і знешніх інвестыцыяў — найперш у новыя і высокія тэхналогіі»*. М.Цэдрык паведаміў, што ў склад СЭЗ прапануецца ўключыць плошчы ў памеры 1.390 гектараў. У раёне аэрапорта «Мінск-1» прапануецца арганізаваць рамонт і тэхнічнае абслугоўванне авіяцыйнай тэхнікі, выпуск новых высокастойкіх матэрыялаў для рамонту ўзлётных палос аэрадромаў. У прамысловым вузле «Шабаны» ёсць магчымасць арганізаваць вытворчасць будаўнічых матэрыялаў і канструкцый, размясціць зборачныя вытворчасці машынабудавання.

БелаПАН

Беларусь—Літва

Беларускі касцёл у Вільні

У хуткім часе ў Вільні будзе зарэгістраваная беларуская рыма-каталіцкая парафія. Дзеля яе Віленская курыя перадае касцёл святога Барталамея на Зарэччы (па-літоўску — *Užupies*).

Гісторыя гэтага касцёла цесна знітаваная з лёсам рыма-каталіцкай канфесіі ў Беларусі. Першапачаткова, у 17 стагоддзі, гэта была капліца на старых могілках святога Бернарда. Пазней капліцу разбудавалі пад парафіяльны касцёл і высвяцілі пад імем святога Барталамея. Пасля паўстання Каліноўскага, у 1864 годзе, касцёл адабралі на карысць Рускай праваслаўнай царквы, а ў 1884 г. бажніцу перабудавалі на расійскі капыл. У 1922 годзе, пры паляках, улады вярнулі храм каталікам, а па вайне камуністы замкнулі бажніцу наогул. Але ў 1989 годзе гэты помнік быў звонку адрэстаўраваны. У сярэдзіне ж да сёньняшняга дня майстэрня скульптараў.

Як паведаміў віленскі біскуп Тунайціс, які ўзначальвае курыю (кіраўнічы орган дыяцэзіі), рашэнне пра перадачу касцёла вернікам-беларусам прынятае, і неўзабаве касцёл пакінуць скульптары. Рамонт будзе праведзены за сродкі біскупата. Таксама біскуп Тунайціс паведаміў, што ўжо зацверджаная кандыдатура будучага душпастыра віленскіх беларусаў — ім стане айцец Ян Шуткевіч, які ўжо перабраўся ў Вільню з Мінска і чакае афіцыйнага прызначэння.

Ксёндз Ян Шуткевіч добра вядомы ў Беларусі. Апошнія тры гады ён быў пробашчам у Мінскім катэдральным саборы. А да таго таксама парафіі ў Лучаях, Лынтупах, Паставах. У размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ а.Шуткевіч сказаў, што ён ганарыцца гэткім прызначэннем. Апроч усяго, ён імкнуўся ў Вільню і з тае прычыны, што тут ён мае бацькоўскую хату, вярнуцца ў якую ён марыў доўгія гады.

Ксёндз а.Шуткевіч скончыў беларускую школу ў Гродне і духоўную семінарыю ў Коўне (Каўнас). Для беларусаў Вільні ён прывёз святыя рэліквіі і каштоўны касцельны рыштунак. Такім чынам, праз пяцьдзесят тры гады перапынку ў Вільні зноў загучыць родная мова ў святынях.

Вільня. Прадмесце Зарэчча. Касцел св.Барталамея, фота 70-х гг.

З Вільні спецыяльна для СВАБОДЫ
Гары КУМАНЕЦКІ

Моладзь адчувае сябе ў Еўропе

Малады Фронт схадзіў у народ: актывісты маладзёжнай арганізацыі правялі апытанне сярод вучняў мінскіх школаў і студэнтаў ВНУ.



Бел-чырвона-белы сцяг у Парыжы — гэта заканамерна.

Маладым мінчукам прапаноўвалася выказаць сваё стаўленне да інтэграцыі з Расіяй, вызначыць арыенціры Беларусі на міжнароднай арэне, а таксама адказаць на пытанне пад якімі сімваламі павінна жыць дзяржава. Ясна, што гэтае аматарскае апытанне не можа прэтэндаваць на статус паўнавартаснага сацыялагічнага даследавання. Але нам здаецца, што і думка 400 чалавек ва ўзросце ад 14 да 25 гадоў усё ж адлюстроўвае пэўныя настроі і тэндэнцыі.

Да інтэграцыі Беларусі з Расіяй у такім выглядзе, як яна адбываецца сёння, станоўча ставяцца 27,6% апытаных, адмоўна — 62,9%, а 12% маладых людзей гэтае пытанне не хвалюе наогул. Дзіўны кантраст: больш за ўсё прыхільнікаў беларуска-расійскага аб'яднання (74%) сярод тых, каму 16 гадоў, а менш за ўсё — сярод 17-гадовых (40,7% апытаных).

Прыхільнікаў інтэграцыі сярод студэнтаў 33,6%, а адмоўна да гэтага працэсу ставяцца 54,6% навучэнцаў ВНУ. У школьным жа асяроддзі 68,2% рэспандэнтаў не жадае аб'яднання з усходнім суседам і толькі 18,2% вучняў выказалі сваю прыхільнасць да інтэграцыі.

Амаль 62% дзяўчат і маладых жанчын выступае супраць інтэграцыі, а мужчыны крыху больш разважлівыя: лічба дасягае 65%.

На пытанне, што павінна быць геапалітычным і эканамічным арыенцірам Беларусі, адказы размеркаваліся наступным чынам: Еўропа — 69,5%, Расія — 8,5%, Амерыка — 5,7%, іншае — 16,2% апытаных.

Толькі 1,2% школьнікаў, апытаных Маладым Фронтам, лічыць, што нашая дзяржава павінна арыентавацца на Расію, а 71,9% навучэнцаў школ бачыць у якасці арыенціра Еўропу. Амерыцы аддаюць перавагу 8,5% школьнікаў. Сярод студэнтаў лічбы наступныя: Расія — 13,4%, Еўропа — 68%, Амерыка —3,3% рэспандэнтаў.

Увогуле, гэтыя лічбы выглядаюць нечакана. Аналагічныя прафесійныя даследаванні, якія праводзіліся ў суседніх краінах, паказваюць, што ў Расіі бачаць Амерыку і амерыканскі лад жыцця ў якасці арыенціра больш за 60%, у Польшчы і на Украіне — каля 50% маладых людзей. Так што відаць, беларуская моладзь сапраўды вельмі еўрапейская.

Сімпатыі моладзі — яўна на баку гістарычных сімвалаў: бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня». За нацыянальную сімволіку выказаліся 73,8% (школьнікі — 82.9%, студэнты — 67,2%), уведзеныя Лукашэнкам сімвалы падабаюцца 12,3% апытаных (9,7% школьнікаў і 14,2% студэнтаў), абыякавыя да гэтай праблемы 13,8% маладых людзей.

Падсумоўваючы вынікі гэтага нерэпрэзентатыўнага апытання, можна, аднак, канстатаваць, што ў асяроддзі мінскай вучнёўскай і студэнцкай моладзі пануюць калі не яўна апазіцыйныя настроі, то ў кожным разе і сімпатый да цяперашняй улады няма. І чым маладзейшыя рэспандэнты, тым большым радыкалізмам вызначаюцца іхнія погляды.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

СКАНДАЛ

Владельцы университета скрылись вместе с деньгами студентов

Критическая ситуация сложилась в последнее время в одном из минских негосударственных высших учебных заведений — Экономико-Лингвистическом университете. Его учредители и одновременно руководители — супруги Эдмунд и Венера Кудасовы — неожиданно исчезли вместе со всеми бухгалтерскими документами и деньгами, собранными с незадачливых студентов и их родителей.

Экономико-Лингвистический университет (ЭЛУ) был основан три с половиной года назад приехавшими в то время в Беларусь супругами Кудасовыми. Специальность, по которой обучались в университете студенты — «бизнес-переводчик» — была для Беларуси на то время новой. Мало того, за последние годы у ЭЛУ так и не появилось ни одного прямого конкурента, и университет остался в Беларуси единственным, готовящим переводчиков для бизнеса, причем владеющих сразу несколькими иностранными языками, а также разбирающихся в экономике и юриспруденции.

Дела у университета и его основателей шли хорошо до тех пор, пока не начался конфликт с министерством образования. Сейчас уже достаточно сложно установить причину личного конфликта Эдмунда и Венеры Кудасовых с руководством минобразования. Но результат известен: университет заставили досрочно проходить аккредитацию. По правилам, аккредитация частного высшего учебного заведения проводится после пяти лет работы. В ЭЛУ «аккредиторы» из министерства образования объявились после трех лет работы вуза, что вызвало довольно резкую реакцию владельцев университета. В результате целой череды скандалов руководители ЭЛУ просто прогнали из помещений университета чиновников, которые проверяли соответствие знаний студентов государственным стандартам в сфере образования.

Само собой, аккредитация не была получена, и стороны обратились за разрешением вопроса в суд. Однако рассмотрение дела в суде, по традиции, было отнесено на несколько месяцев — на осень. Тем временем в ЭЛУ продолжались занятия, а летом проводился обычный набор студентов на полную четырехлетнюю программу обучения, а также набор слушателей на языковые курсы при университете. Всего, как удалось выяснить, за обучение заплатили вперед более шестисот студентов, а также значительное число слушателей курсов. В среднем платили по $ 130, но родители некоторых студентов внесли и большие суммы — порой на два года вперед.

По свидетельству некоторых родителей, после доверительного разговора с ректором ЭЛУ (Венерой Кудасовой) они платили за обучение своих чад не через банк, а наличной валютой прямо в ректорском кабинете.

В то же время уже в начале лета прекратилась выплата зарплаты преподавателям. Кудасовы объясняли это необходимостью оплатить аренду помещения вплоть до конца года. Таким образом весь персонал ЭЛУ не получил зарплату за лето и сентябрь-октябрь. Некоторые из преподавателей даже не получили отпускные. Теперь же выяснилось, что аренда помещений была оплачена только до 1 сентября, и сейчас собственник здания ставит вопрос о выселении университета.

На ноябрь было назначено также судебное разбирательство, которое должно было окончательно решить вопрос об аккредитации ЭЛУ. Но, по свидетельству сотрудников, шансов на благоприятный для Кудасовых исход дела было немного.

Эдмунд и Венера Кудасовы исчезли в последних числах октября. Одновременно в ночь их исчезновения из бухгалтерии университета таинственным образом пропала вся бухгалтерская документация и компьютер с программой бухгалтерского учета и соответствующими базами данных. После того как Кудасовы несколько дней не появлялись на работе, их обеспокоенные заместители вскрыли квартиру, где в последнее время проживали супруги. Там обнаружились только сиротливо пылящиеся холодильник и стиральная машина. И никаких следов предпринимателей.

По различным данным, Кудасовы, исчезнув, прихватили с собой от 60 до двухсот тысяч долларов.

Несколько негосударственных вузов уже заявили о готовности взять «осиротевших» студентов к себе на обучение, причем — на льготных условиях.

Виктор ДЕМИДОВ,
«БДГ»

Кошты рэкламнай плошчы ў газеце **СВАБОДА:**
у рэкламным блоку — **42000** руб./см²
на асобнай паласе — **50000** руб./см²
у тэлевізійнай праграме — **56000** руб./см²
на першай паласе — **100000** руб./см²
Форма аплаты - любая. Традыцыйныя скідкі для турыстычных фірм.
Даведкі па тэл.**238-24-41**

CHAMPION
ЛЮБАЯ СПАРТОВАЯ АМУНІЦЫЯ ДЛЯ РУКАПАШНАГА БОЮ.
Тэл. (017) 210-23-77

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
19 лістапада 1997 г., № 128

Венгрыя напэўна ўвойдзе ў NATO

Так вырашыў рэферэндум

За ўступленне ў Паўночна-Атлантычны альянс прагаласавала 85% з тых, хто прыйшоў у нядзелю на выбарчыя ўчасткі. У рэферэндуме ўзялі ўдзел каля 50% грамадзянаў, якія маюць права голасу — а гэта 4 мільёны чалавек. Ім трэба было адказаць толькі на адно пытанне: *«Ці згодныя Вы, што, каб гарантаваць сваю бяспеку, Венгерская Рэспубліка павінна ўступіць у NATO?»* I 85% сказалі: *«Так»*.

Прэзідэнт Венгрыі Арпад Гёнц назваў і гэтае рашэнне «гістарычным» і сказаў, што ягоныя вынікі паўплываюць на далейшы лёс краіны. Ён падзякаваў свайму народу за прынятае рашэнне. У сваім выступе па нацыянальным тэлебачанні прэзідэнт сказаў, што членства Венгрыі ў *NATO* выключае магчымасць новай вялікай вайны.

Нагадаем, што 16 членаў Паўночна-Атлантычнага альянсу *(NATO)* сёлета ў Мадрыдзе згадзіліся прыняць у сваю арганізацыю тры былыя сацыялістычныя краіны: Венгрыю, Чэхію і Польшчу. Пакуль толькі Венгрыя вырашыла вынесці гэтае пытанне на рэферэндум.

Украіна

Расійскія ракеты навучаць лётаць у космас

Украінска-расійскі кансорцыум «Косматрас» пачынае мадэрнізацыю міжкантынентальных балістычных ракет СС-18 для камерцыйных запускаў.

Прэзідэнт Леанід Кучма цвёрда вырашыў, што Украіна будзе касмічнай дзяржавай.

Як паведаміў начальнік міжнароднага ўпраўлення Нацыянальнага касмічнага агенцтва Украіны (НКАУ) Аляксандр Сярдзюк, першая ракета для камерцыйных запускаў з'явіцца ў наступным годзе. Дагавор аб скарачэнні наступальных узбраенняў (СНУ-2) дазваляе пераабсталяваць ракеты для невaенных мэтаў. Больш як 150 такіх ракет яшчэ знаходзяцца на баявым дзяжурстве ў Расіі.

На думку генеральнага дырэктара НКАУ А.Нягоды, новая ракета, якая атрымала назву «Дніпро», можа быць рэальным прэтэндэнтам на ўдзел у вялікім амерыканскім праекце, які прадугледжвае вывад на каляземную арбіту 840 спадарожнікаў для новага пакалення глабальнай камп'ютэрнай сеткі. Па ацэнках спецыялістаў, праграма пераабсталявання ракет патрабуе больш як 100 млн. доляраў капіталаўкладанняў.

Тры эпідэміі адразу

На Украіне больш як 650 тысяч чалавек хварэюць на сухоты, штогод ад гэтай хваробы паміраюць 7-7,5 тысячы ўкраінцаў.

Кожны год выяўляецца 23-24 тысячы новых хворых, гаварылася на паседжанні Кабінета міністраў. На працягу 1990-1996 гадоў колькасць зарэгістраваных выпадкаў розных формаў туберкулёзу павялічылася на 43%, а рэальныя лічбы могуць быць у 1,5-2 разы вышэйшыя.

Акрамя таго, па стане на 1 верасня 1997 года зарэгістраваны 1 мільён 230 тысяч выпадкаў захворванняў на гепатыт — запаленне печані. Таксама ўзрасла пагроза эпідэміі СНІДу (выяўлены 24 тысячы ВІЧ-інфіцыраваных, з іх — 345 хворых на СНІД).

На паседжанні ўкраінскага ўрада прынятая пастанова, у адпаведнасці з якой прадугледжваецца стварэнне ўласнай вытворчасці імунабіялагічных супрацьсухотных прэпаратаў.

Россия

«Союз» против Чубайса

В понедельник в Государственной Думе состоялось учредительное совещание внефракционной группы «Союз».

Депутатская группа «Союз» объединяет 306 депутатов — представителей всех фракций и депутатских групп Думы. Первое общее собрание этой группы намечается провести 19 декабря. В числе основных целей, декларируемых ее лидерами, — активизация работы в Союзе Белоруссии и России, а также дальнейшая интеграция, сначала на экономической, а потом и на политической основе, всех бывших республик СССР. Пока же группа «Союз» занимается тем, что собирает подписи под письмом депутатов к Б.Ельцину с требованием отставки первого вице-премьера Анатолия Чубайса.

Однако *«президент Борис Ельцин никогда не отправит в отставку Анатолия Чубайса под чьим-либо давлением»*, — заявил заместитель председателя Комитета Государственной Думы по бюджетам, налогам, банкам и финансам Алексей Головков (фракция «Наш Дом — Россия»). *«Ошибаются те, кто считает, что с президентом можно торговаться по поводу Чубайса»*, — подчеркнул парламентарий.

Вице-премьер Анатолий Чубайс точно знает, что просто так Ельцин его не отдаст.

Чечня

Полторы тысячи пропавших без вести

По данным Комиссии по военнопленным до сих пор остается неизвестной судьба 1.459 российских военнослужащих и 100 гражданских специалистов, пропавших в годы чеченской войны.

Уже после вывода российских войск с территории Чечни здесь пропали без вести еще 120 военных, около 70 гражданских лиц и 12 иностранцев. Освобождено же с января по сентябрь было всего около 140 человек, отмечает газета «Российские вести».

Нагорный Карабах и противопехотные мины

Ереван готов использовать право вето, если на встрече министров иностранных дел стран ОБСЕ в Копенгагене 18-19 декабря будет принят документ, противоречащий интересам Армении и Нагорного Карабаха.

Президент Армении Левон Тер-Петросян.

Как заявил пресс-секретарь министерства иностранных дел Армении А.Гаспарян, на сегодня задействованы все представительства Армении в зарубежных странах с тем, чтобы принятый в Копенгагене документ способствовал возобновлению переговорного процесса по Нагорному Карабаху.

МИД Армении предполагает, что *«Азербайджан на этом форуме попытается протащить выгодный для себя документ»*. Позиция Еревана остается прежней: народ Нагорного Карабаха должен реализовать свое право на самоопределение и получить гарантии безопасности.

Между тем в понедельник в Ереване распространено специальное сообщение МИД Армении в связи с предстоящим 2 декабря подписанием в Оттаве (Канада) конвенции о запрещении противопехотных мин. В документе подчеркивается, что для Армении присоединение к конвенции о запрещении противопехотных мин было бы преждевременным, поскольку Азербайджан отказывается со своей стороны даже рассматривать этот вопрос. По данным армянского МИД, вдоль границы с Арменией (протяженность 800 км) Азербайджан разместил от 6.000 до 8.000 таких мин. На разминирование всей территории, по мнению армянских военных экспертов, потребуется от 8 до 10 лет.

Президент Азербайджана Гейдар Алиев.

Таджикистан

За возвращение беженцев заплатит ООН

Представитель Объединенной таджикской оппозиции возглавит одну из силовых структур Таджикистана.

Договоренность об этом достигнута во время встречи в понедельник в Душанбе президента Таджикистана Эмомали Рахмонова с председателем Комиссии по нацпримирению, лидером ОТО Саидом Абдулло Нури.

Всего в правительство должны быть введены 30% представителей Объединенной оппозиции, однако пока не сообщается, какие именно министерские портфели будут отданы.

Между тем специальный посланник генерального секретаря ООН Г.-Д.Меррем сообщил, что персонал миссии наблюдателей ООН в Таджикистане будет увеличен более чем в 2,5 раза. В настоящее время персонал миссии, включая гражданских сотрудников, составляет 100 человек, из которых 45 — военные наблюдатели. Вскоре количество только военных наблюдателей увеличится до 120 офицеров.

Среди новых задач — подготовка бойцов Объединенной таджикской оппозиции к реинтеграции в правительственные силовые структуры. На проведение запланированных мероприятий миссии наблюдателей ООН в Таджикистане требуется как минимум 65 млн. долларов, подчеркнул Г.Меррем. Из них 9,5 млн. — для оказания помощи вернувшимся из Афганистана 10 тыс. беженцев.

ЮНЕСКО поможет преодолеть последствия Чернобыля

В 1998 году ЮНЕСКО продолжит программу оказания помощи Украине по ликвидации последствий чернобыльской катастрофы.

Генеральный директор ЮНЕСКО Федерико Майор на встрече в Киеве с вице-премьером С.Тигипко заявил, что по этой программе ЮНЕСКО *«будут выделены определенные средства»*. Ф.Майор также пообещал, что ЮНЕСКО выделит средства на поддержку национальной библиотеки им.В.Вернадского и создание лаборатории по анализу последствий чернобыльской катастрофы.

Как отметил вице-премьер, в ходе переговоров было достигнуто соглашение о возобновлении ЮНЕСКО программы стажировки украинских журналистов на Западе и о поддержке развития туризма, в частности в издании и распространении справочной литературы об Украине.

По сообщениям агентств БелаПАН, УНІАН, Интерфакс, AFP, Reuter, CNN

Шеварднадзе возмущен решением Черномырдина

Президент Грузии Эдуард Шеварднадзе назвал «выходящим за всякие нормы» решение премьера РФ Виктора Черномырдина о ввозе из Абхазии в РФ мандаринов и другой сельхозпродукции.

Э.Шеварднадзе расценил распоряжение В.Черномырдина, как стремление *«создать тепличные условия сепаратистам»*. Президент считает также, что этим распоряжением проигнорированы решения саммита СНГ по Абхазии. На основании решения саммита СНГ В.Черномырдин еще 7 месяцев назад должен был посетить зону конфликта и вместе с грузинской стороной принять дополнительные меры по урегулированию. Однако В.Черномырдин *«не вспомнил, что такое решение существует»*, отметил руководитель Грузии. Обращаясь к гражданам России, Э.Шеварднадзе напомнил, что мандарины, которые появятся на их столе, *«собраны во дворах сожженных и разграбленных домов грузинских беженцев»*.

Виктор Черномырдин делает вид, что обиделся.

Между тем Россия, как обычно, старается выдать политическую непорядочность за великодушие и покровительство. Виктор Черномырдин, по словам начальника департамента информации российского правительства И.Шабдарасулова, считает заявления Эдуарда Шеварднадзе «безосновательными». Дескать, в России *«сезонные закупки сельхозпродукции рассматривают как гуманитарную помощь всему населению Абхазии, оказавшемуся в тяжелейшем положении из-за грузино-абхазского конфликта, — в том числе и беженцам»*. Каким образом покупка мандаринов по явно заниженным ценам может помочь беженцам, которые несколько лет назад были вынуждены покинуть свои усадьбы, источник в правительстве предпочел не уточнять.

Эдуард Шеварднадзе искренне возмущен.

Стеллажи и стойки
– Для библиотек
– Для книжных магазинов
– Торговые (в том числе для уличной торговли)
– Офисные и выставочные

Тел. (017) 210-02-53, факс 236-24-41

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Галоўная вяршыня Каўказа пад бел-чырвона-белым сцягам

Альпіністы Мінскага гарадскога турыстычнага клуба гэтым летам падняліся на самы высокі пункт Каўказа — гару Эльбрус. На вяршыні — а гэта 5.642 м над узроўнем мора — яны ўсталявалі беларускі сцяг.

У складзе гэтай групы альпіністаў былі двое студэнтаў трэцяга курса геаграфічнага факультэта БДУ Дзмітрый Юдчыц і Генадзь Кароль, з імі сустрэўся карэспандэнт СВАБОДЫ.

— Як даўно вы ходзіце ў горы?

Д.Юдчыц: — З першага года вучобы мы далучыліся да універсітэцкага альпінісцкага клуба «Рэха». Першыя два гады хадзілі па горных маршрутах Крыма, падымаліся на вышэйшы пункт Карпатаў — гару Гаворла. А калі адчулі сябе падрыхтаванымі — вырашылі пайсці на Каўказ.

— І адразу — на Эльбрус?

Г.Кароль: — Не, спачатку мы зрабілі некалькі трэніровачных узыходжанняў на ніжэйшыя горы і толькі пасля вырашылі штурмаваць найвышэйшую вяршыню Каўказа. Напярэдадні пад'ёму была страшная непагадзь, і на высакагорнай базе сабралася шмат альпінісцкіх групаў, якія чакалі, пакуль надвор'е палепшыцца і можна будзе пачаць узыходжанне. Ноччу нарэшце выпагадзілася, і мы пачалі пад'ём.

Наша група падымалася на заходнюю вяршыню Эльбруса, узыход на якую лічыцца больш складаным. Як нам казалі праваднікі, на гэтым маршруце кожны год гіне некалькі чалавек. Праз шэсць гадзінаў мы дасягнулі вышэйшага пункта Эльбруса — 5.642 метры над узроўнем мора, дзе ўсталявалі нацыянальны сцяг.

— Усталёўваць на вяршыні сцяг — гэта альпінісцкая традыцыя?

Г.К.: — Альпіністы заўсёды бяруць з сабою ў горы альбо сцяг дзяржавы, альбо вымпел свайго клуба — гэта традыцыя. Мы неслі бел-чырвона-белы сцяг таму, што лічым менавіта яго сімвалам нашай Бацькаўшчыны. Гэта сцяг, абраны самой гісторыяй, а не тымчасовай палітыкай.

— Альпінізм — хобі даволі небяспечнае. Вы не баіцеся за сябе? Дзеля чаго такая рызыка?

Д.Ю.: — Ведаеце, калі ёсць нейкі страх — дык толькі за сваіх родных: калі нешта са мной здарыцца, для іх гэта быў бы цяжкі ўдар. Мы ж ідзём на трасу зусім свядома. Рызыка, безумоўна, вельмі вялікая, але ў такіх экстрэмальных умовах якраз і загартоўваецца дух чалавека.

Гутарыў **Альгерд НЕВЯРОЎСКІ**



Беларускі сцяг на вяршыні Эльбруса. Не верыш — правер!

Трэнер зборнай і лепшы футбаліст — за рэформу чэмпіянату краіны!

Скончыўся 7-ы нацыянальны футбольны чэмпіянат. Мінскае «Дынама» вярнула сабе тытул лепшай каманды краіны пасля нядоўгага перапынку — усяго адзін год. Бабруйская «Белшына» ўрэшце саступіла дынамаўцам, але і бабруйчане вартыя добрага слова: яны памянялі леташнюю бронзу на сёлетняе срэбра. Футбалісты віцебскага «Лакаматыва-96» упершыню сталі прызёрамі. Раней другі віцебскі клуб — «КІМ» (пазней— «Дзвіна») тройчы атрымліваў медалі чэмпіянатаў. Сёлета згубілі свае месцы ў наймацнейшай лізе старажылы — магілёўскае «Тарпеда-Кадзіна» і салігорскі «Шахцёр».

Зборная Беларусі правaліла свой дэбют у адборачным турніры чэмпіянату свету. З другога боку, некалькі членаў нашай зборнай паспяхова выступаюць за кіеўскае і маскоўскае «Дынама», маскоўскія «Спартак», «Лакаматыў» і іншыя расійскія клубы.

Сёння на старонках СВАБОДЫ сваімі меркаваннямі пра мінулы футбольны сезон дзеляцца яго ўдзельнікі трэнер Веніямін Арзамасцаў і футбаліст Андрэй Лаўрык.

Веніямін АРЗАМАСЦАЎ, бронзавы прызёр чэмпіянату СССР 1963 г. у складзе мінскага «Дынама», цяпер — трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі і мінскай каманды «Дынама-93».

— Якія плюсы і мінусы сёлетняга чэмпіянату?

— Станоўчым вынікам я лічу, што мінскае «Дынама» здолела пераадолець адставанне ад «Белшыны» ў 8 ачкоў і заваяваць чэмпіёнскі тытул, які па праву належыць гэтай моцнай камандзе. У першым крузе парадавала і «Белшына», якая да таго ж выйграла і Кубак Беларусі. Відавочна памацнеў наваполацкі «Нафтан-Дэвон», спадабалася сімпатычная каманда Брэста, плённа працуе ў мінскім «Тарпеда» Анатоль Юрэвіч. На маю думку, ужо ў наступным сезоне тарпедаўцы будуць змагацца за самыя высокія месцы. Салідна выглядаў «Лакаматыў-96». Менавіта нечаканая перамога віцебцаў над «Белшынай» стала пераломам у ходзе чэмпіянату, які даў магчымасць ажывіцца мінскаму «Дынама».

Расчараванне выклікала гульня мазыран. Відаць, кіраўніцтва горада дапусціла стратэгічную памылку, калі запрасіла расійскага трэнера і футбалістаў з Грузіі. Не зусім пераканаўча выглядала ў другім крузе «Белшына»: мелі такую фору — і не здолелі ўзяць 1-е месца! Слаба гулялі ўвосень і футбалісты нашай каманды «Дынама-93». Буду самакрытычным: прычыны — у памылках трэнерскага штаба. Чакаў большага і ад «Атакі», у складзе якой шмат маладых, здольных спартсменаў. Я лічыў, што яны паказычуць нервы лідэрам, але нешта не атрымалася.

— Тры з чатырох камандаў ЗАТ «Футбольны клуб «Дынама» Мінск» — «Дынама-93", «Атака», «Маладзечна» — паказалі найгоршыя вынікі ў чэмпіянатах краіны, прычым маладзечанцы ледзь утрымаліся ў лізе мацнейшых. Гэта выпадкова?

— Не хачу каментаваць унутрыклубныя справы, але я больш не ведаю ніводнага клуба ў сусветным футболе, які б у вышэйшай лізе прадстаўляла некалькі камандаў.

— Расійскія і ўкраінскія клубы, быццам пыласос, высмоктваюць самых таленавітых беларускіх футбалістаў, збядняючы наш і так небагаты на зорак чэмпіянат...

— Ад «легіянерства» больш за ўсіх церпіць мінскае «Дынама», таму з кожным годам ягоны клас крыху падае. Іншыя каманды гэта закранае ў меншай ступені. Наадварот, я б сказаў, што сераднячкі падцягваюцца, таму ўзровень нашага чэмпіянату ў цэлым не паніжаецца.

З другога боку, калі сыходзяць вядучыя футбалісты, з'яўляюцца вакансіі, а значыць, і магчымасці праявіць сябе для маладых, перспектыўных спартсменаў.

— Ці не час рэфармаваць наш чэмпіянат: скараціць колькасць камандаў вышэйшай лігі з 16 да 12 і праводзіць гульні па двухэтапнай сістэме? Тады мацнейшыя сустракаліся б паміж сабою не двойчы за чэмпіянат, а чатыры разы і кожная каманда праводзіла б не па 30, а па 32 гульні.

— Так, гэта б абвастрыла канкурэнцыю і паспрыяла б росту майстэрства футбалістаў. Я падтрымліваю гэтую ідэю і лічу яе рэалізацыю наспелай.

— А якая сітуацыя ў нашай нацыянальнай зборнай?

— Вынік сезона — апошняе месца ў групавым адборачным турніры чэмпіянату свету — нікога задаволіць не можа. Мала забілі, многа прапусцілі, асабліва ў гасцях. У камандзе шмат маладых спартсменаў, іхняе майстэрства яшчэ няўстойлівае. Таму ў выязных матчах на іх уплывалі негатыўныя фактары: агрэсіўная гульня гаспадароў, псіхалагічны ціск чужых заўзятараў.

Аднак ёсць на што спадзявацца. Сфармавалася аснова з 15—16 футбалістаў, на якіх мы будзем рабіць стаўку ў наступным адборачным цыкле чэмпіянату Еўропы. Ёсць праблемы з шэрагам пазіцыяў, напрыклад, апошняга абаронцы, але гэта вырашальна. Апошнія матчы дома зборная правяла годна, а таму, на маю думку, ёсць падставы для аптымізму.

Андрэй ЛАЎРЫК («Дынама», Мінск), чэмпіён краіны і лепшы футбаліст Беларусі 1997 года.

— Вы верылі, што ўдасца ліквідаваць 8-ачковае адставанне і абыграць «Белшыну»?

— Шчыра кажучы, не верыў. І не толькі я. Але наш галоўны трэнер Анатоль Байдачны ні на хвіліну не траціў аптымізму. Ён увесь час даводзіў, што галоўнае — перамога ў кожным матчы, і тады прыйдзе агульны поспех. Усё выйшла па-ягонаму.

— Байдачны прыйшоў на змену Шчокіну пасля 9-ці тураў, у той час «Дынама» займала нязвыклае 4-е месца. Што змянілася з новым трэнерам?

— Усё — ад вучэбна-трэніровачнага працэсу да мікраклімату, прычым — у лепшы бок. Вы, напэўна, ведаеце, што 3—4 месяцы ў каманды былі сур'ёзныя матэрыяльныя праблемы. У той час калектыў не развалiўся толькі таму, што ўсе мы вельмі верылі Байдачнаму. У працы ён патрабавальны, але свае патрабаванні ўмее выказваць прымальна і зразумела для футбалістаў.

— Вашая выніковасць вельмі высокая для абаронцы — 8 галоў і 6 галявых перадачаў...

— Байдачны паставіў мне задачу: не толькі абараняцца, але пастаянна падтрымліваць атаку. Што я і рабіў.

— Ці задавальняе вас як удзельніка нацыянальнага чэмпіянату ўзровень футбола?

— Відаць, пра недастаткова высокі ўзровень чэмпіянату пішуць правільна. Безумоўна, майстэрства хутчэй расце ў такіх матчах, як нашая сустрэча другога круга ў Бабруйску з «Белшынай».

Не хачу пакрыўдзіць аўтсайдэраў, але, на маю думку, чэмпіянат быў бы цікавейшым і больш якасным, калі б 1-я ліга скарацілася да 12 камандаў, каб вядучыя клубы часцей сустракаліся паміж сабою. Адначасова памацнела б і 2-я ліга.

— Вы едзеце ў маскоўскі «Лакаматыў» на заробкі ці гэта прамежкавы этап на шляху да больш высокіх мэтаў?

— Хацелася б, каб гэта быў этап самаўдасканалення. Было б здорава пагуляць у чэмпіянаце адной з вядучых футбольных дзяржаваў.

— Чаму менавіта ў «Лакаматыў»?

— У мяне было некалькі прапановаў, але гэтая падалася самай канкрэтнай і рэальнай. Дый параіў таварыш па зборнай Беларусі, Сяргей Гурэнка, які гуляе там ужо пару гадоў. Важна і тое, што галоўны трэнер «Лакаматыва» Юрый Сёмін у добрых дачыненнях з Анатолем Байдачным.

— А калі ж нарэшце пачне перамагаць нашая зборная?

— Канечне, у нашай групе наймацнейшымі былі шведы, нас яны пераўзыходзілі на галаву. Мне здаецца, ім проста не пашанцавала. А вось з аўстрыйцамі і шатландцамі дома ж гулялі на роўных. Каманда ў нас маладая, вопыту яшчэ не хапае. Нам бы аднаго разу зачапіць перамогу — і справа зрушыцца з мёртвай кропкі.

Гутарыў **Барыс ТАСМАН**

У паветры — лепшы футбаліст Беларусі 1997 г. Андрэй Лаўрык.

Выніковая табліца

	М	А
1. «Дынама» (Мінск)	74—24	70
2. «Белшына» (Бабруйск)	67—30	66
3. «Лакаматыў-96» (Віцебск)	46—30	59
4. «Днепр» (Магілёў)	48—32	52
5. «Дынама-93» (Мінск)	53—30	49
6. МВКЦ (Мазыр)	39-30	43
7. «Дынама» (Брэст)	44—52	42
8. «Тарпеда» (Мінск)	45—43	42
9. «Нафтан-Дэвон» (Нвп)	40—33	39
10. «Нёман» (Гродна)	32—41	38
11. «Камунальнік» (Слонім)	32—61	30
12. «Атака» (Мінск)	29—44	30
13. «Маладзечна»	28—44	30
14. «Трансмаш» (Мг)	30—52	28
15. «Тарпеда-Кадзіна» (Мг)	29—59	28
16. «Шахцёр» (Салігорск)	22—53	24

Пры аднолькавай колькасці ачкоў вышэй стаяць каманды, у якіх больш перамогаў, потым — тыя, хто мае лепшыя вынікі ў сустрэчах паміж сабой.

P.S. Дарэчы, тытул лепшага футбаліста Беларусі 1997 года 22- гадовы Андрэй Лаўрык атрымаў якраз учора — і мы маем добрую нагоду павіншаваць яго з перамогай (апытанне экспертаў праводзіла спартыўная газета «Прессбол»).

На другім месцы паўабаронца нацыянальнай зборнай і маскоўскага «Спартака» Міраслаў Рамашчанка, на трэцім — лепшы футбаліст мінулага года Уладзімір Макоўскі («Дынама», Мінск).

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад — 32.080
Нумар падпісаны ў друк 17.11.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 380